# Рэдкія манеты Жыгімонта Старога 1508—1529 гадоў у зборах найвялікшых польскіх музеяў

Дзмітры ГУЛЕЦКІ



Сябра Беларускага нумізматычнага таварыства

У ліпені 2007 года мне ўдалося атрымаць дазвол на даследванні і наведаць найвялікшыя музеі Польскай Рэспублікі для вывучэння неапісаных варыянтаў манет Вялікага княства Літоўскага 1508—1529 гадоў. Атрыманая ад супрацоўнікаў гэтых устаноў інфармацыя, а таксама вынікі маіх даследванняў прадстаўлены ў гэтым артыкуле.

На працягу тыдня я працаваў у фондах:

— Нацыянальнага музея ў Кракаве (MNK);

— Нацыянальнага музея ў Варшаве (MNW);

— Замка каралеўскага ў Варшаве (ZKW).

За садзеянне ва ўстанаўленні кантактаў, правядзенне са мной даследніцкіх сесіяў і спаўненне запытаў, без якіх не стаў бы магчымым гэты матэрыял, хачу выказаць падзяку Веславу Капіцкаму (Польскае нумізматычнае таварыства), Яраславу Бодзку, Альжбеце Карчыньскай і Ганне Студніцкай (Нацыянальны музей у Кракаве), Анджэю Раманоўскаму (Нацыянальны музей у Варшаве), Міхалу Завадзкаму і Марце Менцлеўскай (Замак каралеўскі ў Варшаве).

Перадусім мяне цікавілі вельмі рэдкія манеты накшталт пенязя без літары, які Я. Іваноўскі аднёс да першых эмісіяў Жыгімонта Старога, паўгрошаў 1508, 1512 гадоў (з поўнай датай), з колцамі перад Арлом, а таксама спрэчныя манеты, апісаныя Эмерыкам Гутэн-Чапскім, і неапісаныя раней варыяцыі паўгрошаў.

У MNK і ZKW аказалася дакладная база звестак, якія дазволілі атрымаць спіс паўгрошаў Жыгімонта Старога ў зборах кожнага з музеяў, да таго ж з пазначэннем інвентарнага нумара і вагі. Асаблівую цікавасць уяўляе інфармацыя з кракаўскага музея, бо ягоны збор багаты на незвычайныя варыяцыі манет. У музеі захоўваецца знакамітая калекцыя графа Эмерыка Гутэн-Чапскага. Апроч таго, збор складзены таксама з манет, якія паходзяць з калекцый Кастрэбскага, Косткі, Закрэўскага, Рышарда і іншых. Гэта інфармацыя дазваляе рабіць пэўныя статыстычныя выкладкі, а таксама паскорыць іншым даследнікам камунікацыю з MNK, таму, безумоўна, будзе карысна прывесці яе тут *(табліца 1)*.

І ўсё ж такі манета, якая выклікае найбольш спрэчак і сумневаў і якую апішу ў першую чаргу, — не паўгрош, а пенязь з Пагоняй і Арлом, так званы “пенязь без літары” *(малюнак 1)*. Гэта манета паходзіць са збору Э. Гутэн-Чапскага, які набыў яе ў свой час за 8 расійскіх рублёў.

Традыцыйна гэты пенязь адносіўся даследнікамі да першых эмісіяў Аляксандра, здзейсненых ім яшчэ пры жыцці яго бацькі Казіміра ў 1490—1492 гадах. У 1999 годзе Я. Іваноўскі аднёс яго да ранніх эмісіяў Жыгімонта Старога (1506 год). Паводле яго версіі, па смерці Аляксандра мынца працягвала працаваць “пэўны час”, б’ючы “пенязі без літары” [Ivanauskas, Douchis, 1, с. 47]. Некаторыя іншыя даследнікі, у тым ліку гарадзенец В. Какарэка, які прысвяціў мынцарству Аляксандра асобны даклад на міжнароднай нумізматычнай канферэнцыі ў Раўбічах (2007), лічаць, што “пенязі без літары” — гэта “фальсыфікаты XIX стагоддзя альбо мане-



***Малюнак 1.*** *Пенязь “без літары” з калекцыі Э. Гутэн-Чапскага. Вага 0,261 г.*

Табліца 1

## Паўгрошы Жыгімонта Старога ў зборы Нацыянальнага музея ў Кракаве (MNK)

(Дадзеныя на 17.08.2007)

1. 1508, Cz. 5637, VII-P-13197, 1,175 g
2. 1509, VII-P-13198, 1,234 g
3. 1509, VII-P-13199, 1,276 g
4. 1509, Cz. 224, VII-P-13200, 1,240 g
5. 1509, Cz. 225, VII-P-13201, 1,361 g
6. 1509, Cz. 4830, VII-P-13202, 1,130 g
7. 1509, Cz. 7053, VII-P-13203, 1,322 g
8. 1509, Cz. 7054, VII-P-13204, 1,260 g
9. 1509, Cz. 10050, VII-P-13205, 1,167 g
10. 1509, VII-P-13206, 1,192 g
11. 1509, VII-P-13207, 1,134 g
12. 1509, VII-P-13208, 1,214 g
13. 1509, VII-P-13209, 1,160 g
14. 1509, VII-P-13210, 1,150 g
15. 1509, VII-P-13211, 1,182 g
16. 1509, VII-P-13212, 1,088 g
17. 1509, VII-P-13213, 0,916 g
18. 1509, VII-P-13214, 1,064 g
19. 1509, VII-P-13215, 1,067 g
20. 1509, VII-P-13216, 1,159 g
21. 1509, VII-P-13217, 1,133 g
22. 1510, Cz. 227, VII-P-13218, 1,243 g
23. 1510, Cz. 228, VII-P-13219, 1,181 g
24. 1510, Cz. 7055, VII-P-13220, 1,202 g
25. 1510, Cz. 7056, VII-P-13221, 1,183 g
26. 1510, Cz. 7057, VII-P-13222, 1,247 g
27. 1510, Cz. 10051, VII-P-1,149 g
28. 1510, VII-P-13224, 1,167 g
29. 1510, VII-P-13225, 1,134 g
30. 1510, VII-P-13226, 0,991 g
31. 1510, VII-P-13227, 1,130 g
32. 1510, VII-P-13228, 1,143 g
33. 1510, VII-P-13229, 1,151 g
34. 1510, VII-P-13,230, 1,274 g
35. 1510, VII-P-13231, 1,149 g
36. 1510, VII-P-13232, 1,196 g
37. 1510, VII-P-13233, 1,118 g
38. 1510, VII-P-13234, 1,105 g
39. 1510, VII-P-13235, 1,150 g
40. 1511, Cz. 230, VII-P-13236, 1,248 g
41. 1511, Cz. 231, VII-P-13237, 1,257 g
42. 1511, Cz. 232, VII-P-13238, 1,214 g
43. 1511, Cz. 7058, VII-P-13239, 1,189 g
44. 1511, Cz. 10052, VII-P-13240, 1,132 g
45. 1511, Cz. 10053, VII-P-13241, 1,186 g
46. 1511, VII-P-13242, 1,344 g
47. 1511, VII-P-13243, 1,141 g
48. 1511, VII-P-13244, 1,145 g
49. 1511, VII-P-13245, 1,182 g
50. 1511, VII-P-13246, 1,130 g
51. 1512, Cz. 7062, VII-P-13247, 1,152 g
52. 1512, Cz. 233, VII-P-13248, 1,288 g
53. 1512, Cz. 234, VII-P-13249, 1,139 g
54. 1512, Cz. 5638, VII-P-13250, 0,971 g
55. 1512, Cz. 7059, VII-P-13251, 1,235 g
56. 1512, Cz. 7060, VII-P-13252, 1,233 g
57. 1512, Cz. 7061, VII-P-13253, 1,130 g
58. 1512, Cz. 9319, VII-P-13254, 1,201 g
59. 1512, VII-P-13255, 1,181 g
60. 1512, VII-P-13256, 1,184 g
61. 1512, VII-P-13257, 1,164 g
62. 1512, VII-P-13258, 1,146 g
63. 1512, VII-P-13259, 1,277 g
64. 1512, VII-P-13260, 1,218 g
65. 1512, VII-P-13261, 1,211 g
66. 1512, VII-P-13262, 1,150 g
67. 1512, VII-P-13263, 1,151 g
68. 1512, VII-P-13264, 1,224 g
69. 1512, VII-P-13265, 1,128 g
70. 1512, VII-P-13266, 1,181 g
71. 1512, VII-P-13267, 1,279 g
72. 1512, VII-P-13268, 1,283 g
73. 1512, VII-P-13269, 1,097 g
74. 1513, Cz. 236, VII-P-13270, 1,336 g
75. 1513, Cz. 237, VII-P-13271, 1,174 g
76. 1513, Cz. 238, VII-P-13272, 1,248 g
77. 1513, Cz. 240, VII-P-13273, 1,171 g
78. 1513, Cz. 241, VII-P-13274, 1,198 g
79. 1513, Cz. 242, VII-P-13275, 1,273 g
80. 1513, Cz. 7063, VII-P-13276, 1,119 g
81. 1513, VII-P-13277, 1,213 g
82. 1513, VII-P-13278, 1,080 g
83. 1513, VII-P-13279, 1,235 g
84. 1513, VII-P-13280, 1,247 g
85. 1513, VII-P-13281, 1,222 g
86. 1513, VII-P-13282, 1,218 g
87. 1513, VII-P-13283, 1,171 g
88. 1513, VII-P-13284, 1,128 g
89. 1513, VII-P-13285, 1,163 g
90. 1513, VII-P-13286, 1,082 g
91. 1514, VII-P-13287, 1,134 g
92. 1514, VII-P-13288, 1,096 g
93. 1514, VII-P-13289, 1,278 g
94. 1514, VII-P-13290, 1,086 g
95. 1514, VII-P-13291, 1,179 g
96. 1514, VII-P-13292, 1,151 g
97. 1514, VII-P-13293, 1,216 g
98. 1514, Cz. 243, VII-P-13294, 1,067 g
99. 1514, Cz. 244, VII-P-13295, 1,367 g
100. 1514, Cz. 245, VII-P-13296, 1,357 g
101. 1514, Cz. 246, VII-P-13297, 1,081 g
102. 1514, Cz. 7064, VII-P-13298, 1,002 g
103. 1514, Cz. 7065, VII-P-13299, 1,149 g
104. 1514, Cz. 10056, VII-P-13300, 1,139 g
105. 1515, Cz. 247, VII-P-13301, 1,182 g
106. 1515, Cz. 248, VII-P-13302, 1,254 g
107. 1515, Cz. 7066, VII-P-13303, 1,202 g
108. 1515, Cz. 9320, VII-P-13304, 1,206 g
109. 1515, Cz. 10057, VII-P-13305, 1,110 g
110. 1515, Cz. 13306, VII-P-13306, 1,114 g
111. 1515, VII-P-13307, 1,257 g
112. 1515, VII-P-13308, 1,149 g
113. 1515, VII-P-13309, 1,378 g
114. 1516, Cz. 249, VII-P-13310, 1,321 g
115. 1516, Cz. 7067, VII-P-13311, 1,372 g
116. 1516, Cz. 7068, VII-P-13312, 1,134 g
117. 1516. Cz. 9321, VII-P-13313, 1,221 g
118. 1516, Cz. 10059, VII-P-13314, 1,170 g
119. 1517, Cz. 250, VII-P-13315, 1,184 g
120. 1517, Cz. 251, VII-P-13316, 1,159 g
121. 1517, Cz. 7069, VII-P-13317, 1,389 g
122. 1517, Cz. 7070, VII-P-13318, 1,169 g
123. 1517, Cz.7071, VII-P-13319, 1,202 g
124. 1517, Cz. 7072, VII-P-13320, 1,203 g
125. 1517, Cz. 9322, VII-P-13321, 1,173 g
126. 1518, Cz. 252, VII-P-13322, 1,147 g
127. 1518, Cz. 253, VII-P-13323, 1,204 g
128. 1518, Cz. 254, VII-P-13324, 1,224 g
129. 1518, Cz. 7073, VII-P-13325, 1,085 g
130. 1518, Cz. 10060, VII-P-13326, 1,182 g
131. 1518, VII-P-13327, 1,202 g
132. 1518, Cz. 10061, VII-P-13328, 1,175 g
133.1519, Cz. 256, VII-P-13329, 1,247 g
134. 1519, Cz. 257, VII-P-13330, 1,190 g
135. 1519, Cz. 258, VII-P-13331, 1,210 g
136. 1519, Cz. 5639, VII-P-13332, 1,148 g
137. 1519, Cz. 7074, VII-P-13333, 1,273 g
138. 1519, Cz. 7075, VII-P-13334, 1,120 g
139. 1519, Cz. 10062, VII-P-13335, 1,212 g
140. 1519, VII-P-13336, 1,135 g
141. 1519, VII-P-13337, 1,180 g
142. 1519, VII-P-13338, 1,170 g
143. 1519, VII-P-13339, 1,131 g
144. 1519, VII-P-13340, 1,148 g
145. 1519, VII-P-13341, 1,246 g
146. 1519, VII-P-13342, 1,086 g
147. 1519, VII-P-13343, 0,893 g
148. 1519, VII-P-13344, 1,125 g
149. 1520, Cz. 260, VII-P-13345, 1,301 g
150. 1520, Cz. 261, VII-P-13346, 1,121 g
151. 1520, Cz. 7076, VII-P-13347, 1,172 g
152. 1520, VII-P-13348, 1,224 g
153. 1520, VII-P-13349, 1,017 g
154. 1520, VII-P-13350, 1,244 g
155. 1521, Cz. 7077, VII-P-13351, 1,163 g
156. 1521, Cz. 7078, VII-P-13352, 1,265 g
157. 1521, Cz. 7079, VII-P-13353, 1,229 g
158. 1521, Cz. 9326, VII-P-13354, 1,075 g
159. 1521, Cz. 9326, VII-P-13355, 1,068 g

Табліца 1 (працяг)

160. 1521, Cz. 10063, VII-P-13356, 1,202 g
161. Cz. 10064, VII-P-13357, 1,201 g
162. 1521, VII-P-13358, 1,247 g
163. 1521, VII-P-13359, 0,998 g
164. 1521, VII-P-13360, 1,220 g
165. 1521, VII-P-13361, 0,963 g
166. 1521, VII-P-13362, 1,143 g
167. 1522, Cz. 263, VII-P-13363, 1,115 g
168. 1522, Cz. 7080, VII-P-13364, 1,071 g
169. 1522, Cz. 7081, VII-P-13365, 1,153 g
170. 1522, Cz. 9327, VII-P-13366, 1,240 g
171. 1522, Cz. 10065, VII-P-13367, 1,155 g
172. 1522, VII-P-13368, 1,008 g
173. 1522, VII-P-13369, 1,224 g
174. 1522, VII-P-13370, 1,189 g
175. 1523, Cz. 265, VII-P-13371, 1,174 g
176. 1523, Cz. 7082, VII-P-13372, 1,120 g
177. 1523, Cz. 10063, VII-P-13373, 1,200 g
178. 1523, VII-P-13374, 1,218 g
179. 1523, VII-P-13375, 1,172 g
180. 1523, VII-P-13376, 0,947 g
181. 1524, Cz. 266, VII-P-13377, 1,212 g
182. 1524, Cz. 10067, VII-P-13378, 1,226 g
183. 1524, Cz. 10068, VII-P-13379, 1,193 g
184. 1524, VII-P-13380, 1,181 g
185. 1525, Cz. 268, VII-P-13381, 1,274 g
186. 1525, Cz. 9328, VII-P-13382, 1,205 g
187. 1526, Cz. 7083, VII-P-13383, 1,161 g
188. 1526, Cz. 272, VII-P-13384, 1,024 g
189. 1527, Cz. 279, VII-P-13385, 1,217 g
190. 1527, Cz. 280, VII-P-13386, 1,214 g
191. 1527, Cz. 7084, VII-P-13387, 1,179 g
192. 1527, Cz. 9339, VII-P-13388, 1,115 g
193. 1527, VII-P-13389, 1,215 g
194. 1527, VII-P-13390, 1,252 g
195. 1527, Cz. 235, VII-P-13391, 1,104 g
196. 1527, Cz. 281, VII-P-13392, 1,124 g
197. 1527, Cz. 5640, VII-P-13393, 1,147 g
198. 1528, Cz. 4833, VII-P-13394, 1,204 g
199. 1528, Cz. 9331, VII-P-13395, 1,228 g
200. 1528, VII-P-13396, 1,201 g
201. 1528, Cz. 288, VII-P-13397, 0,993 g
202. 1528, Cz.2563, VII-P-13398, 1,173 g
203. 1528, VII-P-13399, 1,235 g
204. 1529, Cz. 294, VII-P-13400, 1,052 g
205. 1529, Cz. 9333, VII-P-13401, 1,125 g
206. 152?, VII-P-13402, 1,176 g
207. 15??, VII-P-13403, 1,252 g
208. 15??, VII-P-13404, 1,157 g
209. 15??, VII-P-13405, 1,196 g
210. 15??, VII-P-13406, 1,182 g
211. 15??, VII-P-13407, 1,176 g

ты з часткова неадбітай выявай" [Какареко, 3]. Аргументы апошніх (дарэчы, даволі моцныя) грунтуюцца як на надзвычайнай рэдчыні гэтых манет, так і на тым, што такі дробны элемент параўнальна лёгка для фальшара выдаліць з поля манеты. Таксама, калі некаторыя часткі выявы, напрыклад, Пагоні, могуць быць неадбітыя, дык чаму ж такой заганы не можа здарыцца з літарай *А*?

Каб высветліць, які з поглядаў мае больш правоў на існаванне, трэба разгледзець некаторыя пытанні мынцарства Аляксандра, галоўным чынам тыпы выяваў Пагоні і Арла на пенязях гэтага князя. В. Какарэка выдзяляе для пенязяў адзін тып Пагоні і тры тыпы Арла [Какареко, 3]. Я.Іваноўскі выдзяляе тры тыпы Пагоні і тры тыпы Арла [Ivanauskas, Douchis, 1, с. 37, 41].

Абодва даследнікі спрабуюць выявіць паслядоўнасць эмісіяў на падставе розніцы іканаграфічных выяваў, што, на мой пагляд, здаецца дачасным. Шляхам аналізу тыпаў Пагоні і Арла на пенязях Аляксандра "з літарай" я паспрабаваў праверыць класіфікацыі вышэйзгаданых даследнікаў і прыйшоў да даволі падобнага падзелу. Нумарацыя тыпаў выяваў была абрана адвольна і ніякім чынам не перыядызуе манеты. Паколькі вельмі складана знайсці выдатна выбіты пенязь Аляксандра, дзе былі б добра бачнымі ўсе элементы выявы, вырашана на гэты момант абмежавацца выдзяленнем падтыпаў аверса ў тыпе П1 В. Какарэкі [Какареко, 3], якія, у сваю чаргу, ёсць і ў Я. Іваноўскага *(малюнкі 2 і 3)*. Пры гэтым улічваўся і кшталт літары *А*, дробныя адрозненні якога нязменна суправаджалі дробныя адрозненні ў выяве Пагоні.

Такім чынам, выдзелена 3 падтыпы тыпа Пагоні 1 (чысты тып 1 прысутнічае ў зборы MNK, найлепшыя экзэмпляры — VII-P-7.649, VII-P-7.650):



1 1а 1б 1в

***Малюнак 2.*** *Тыпы Пагоні на пенязях Аляксандра.*


1


2


3

*Малюнак 3. Тыпы Арла на пенязях Аляксандра.*

а) колца з кропкай унутры на плячы вершніка, менш мудрагелістая выява хваста, форма рукаяткі мяча, большая гатычная літара ***А***. Ёсць дзве манеты з добра захаванымі аверсамі такога тыпа (у зборы MNK — VII-P-7.651, VII-7.652);

б) колца без кропкі на плячы вершніка, маленькая "прыціснутая" гатычная літара ***А*** (у зборы MNK — VII-P-7.659);

в) шырэйшая выява, хвост разыходзіцца толькі ў канцы, рэнесансавая літара A (у зборы MNK — VII-P-7.710, VII-P-7.713, VII-P-7.714, VII-P-7.7150).

Каб паказаць карэляцыю і розніцу паміж вышэйзгаданымі класіфікацыямі і маёй, адпаведнасць тыпаў іканаграфічных выяваў на пенязях Аляксандра прыведзена ў *табліцы 2*.

Пенязь "без літары" са збору MNK мае Пагоню тыпа 1а і Арла тыпа 3. Паводле В. Какарэкі, такія выявы маглі змяшчацца на пенязі Аляксандра ў пачатковы перыяд іх эмісіяў (П1 і О1, які адпавядае Арлу з паўграшаў, што маюць рэнесансавыя літары ***M*** і ***N*** у легендах) [Какареко, 3]. Паводле Я. Іваноўскага, гэта тыпы, адпаведна, 2 і 4, якія характэрны для перадапошняе эмісіі манет Аляксандра (перадапошняя Пагоня і апошні Арол, якія сустракаюцца на пенязях з гатычнай ***A***, але таксама (трэба меркаваць, прыблізна падобныя) і на паўгрошах адной з апошніх эмісій з рэнесансавымі літарамі ***M*** і ***N*** у легендах) [Ivanauskas, Douchis, 1, с. 37—40].

Таксама Я. Іваноўскі прыводзіць у сваім каталогу пенязь "без літары", які мае тыпы выяваў 3—4 (1с і 3 паводле маёй класіфікацыі), што адпавядае вядомым пенязям з рэнесансавай літарай ***A*** [Ivanauskas, Douchis, 1, нумар 44:28, с. 47]. На жаль, у каталогу няма здымку, а супрацоўнікі Літоўскага нацыянальнага музея ў Вільні (LNM), на збор якога спасылаецца даследнік, не знайшлі ў сябе такой манеты. Апублікаваных здымкаў іншых пенязяў "без літары" таксама знайсці не ўдалося. Таму на гэты момант прыходзіцца канстатаваць, што калі такія манеты біліся, то адначасова ці непасрэдна побач на часовай лінейцы з пенязямі з гатычнай літарай ***A***, а таксама паўгрошамі з рэнесансавымі літарамі ***M*** і ***N*** у легендах. Адкрытым застаецца пытанне: было гэта ў канцы ці пачатку эмісіяў? Але верагодней за ўсё — у сярэдзіне, бо тлумачыцца тым, што Арол тыпа 3 сустракаецца на пенязях як з гатычнай, гэтак і з рэнесансавай літарай ***A***. "Гатычныя" экзэмпляры маюць яшчэ і іншыя падтыпы Пагоні, а ў выпадку манеты са збору MNK гэта якраз (паводле тыпу Пагоні) патэнцыйна "гатычны" экзэмпляр, а не "рэнесансавы". Іншымі словамі, гэтае спалучэнне тыпаў аверса і рэверса ні што іншае, як пераходны варыянт. Таму аднясенне яго да самага пачатку эмісій Аляксандра, як і эмісій Жыгімонта Старога, вельмі праблематычнае.

Застаецца трэці варыянт — неадбітасць (сапсаваны штэмпель, выпадковасць) альбо падробка. Па выніках агляду манеты можна сцвярджаць, што варыянт з падробкай "з нуля" вылучаны, але застаецца верагоднасць падробкі з сапраўднае манеты — дзе літара *A* была б "счышчаная" з поля пенязя "з літарай". Здымак спрэчнага фрагмента манеты змешчаны на *малюнку 4*. На ім слядоў літары не



***Малюнак 4.** Фрагмент пенязя "без літары" з калекцыі Э. Гутэн-Чапскага — месца, дзе "мусіла б" быць літара А.*

Табліца 2

**Адпаведнасць тыпаў іканаграфічных выяваў на пенязях Аляксандра з прац Я. Іваноўскага [Ivanauskas, Douchis, 1], В. Какарэкі [Какареко, 3] і майго падзялення**

| | Тыпы Пагоні | | | | Тыпы Арла | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Я. Іваноўскі (1999) | 2 | 2 | 1? | 3 | 3 | 2? | 4 |
| В. Какарэка (2007) | П1 | П1 | П1 | П1 | О2? | О3 | О1 |
| Маё падзяленне | 1 | 1а | 1b | 1c | 1 | 2 | 3 |

відаць, наслаенні бруду ці вокіслаў справа ад пляча вершніка не паказваюць якога-небудзь магчымага поля для былой літары *A* (праўда, невядома, як манета захоўвалася цягам стагоддзя і ці не з'явіліся вокіслы ўжо пасля магчымага выдалення літары). Поле манеты пакідае ўражанне некранутага з досыць раўнамерным бляскам. Засцерагае толькі нізкая вага манеты — 0,261 г — пры даволі прыстойным стане захавання.

Прымаючы пад увагу ўсю атрыманую інфармацыю да публікацыі іншых здымкаў пенязяў "без літары", найбольш верагоднай пазіцыяй, на мой пагляд, застаецца версія пра частковую неадбітасць ці пашкоджанне гэтага месца. Але наўрад ці гэта манета можа належаць да эмісій Жыгімонта Старога.

З іншых рэдкіх манет, якія ўжо пэўна належаць да спадчыны часоў Жыгімонта Старога, два музеі (MNK і MNW) маюць паўгрошы 1508 года *(малюнак 5)*.

Яны, падобна, выкананы абсалютна ідэнтычнымі штэмпелямі аверсаў і трошкі рознымі штэмпелямі рэверсаў. Таксама манета са збору MNW, дарэчы найлепшага стану з усіх мне вядомых, здаецца ідэнтычнай манеце з прыватнага збору ў ЗША [Гулецкі, 2, с. 59]. Манета з MNW настолькі цудоўна захавалася і з такімі вострымі элементамі дызайну, што магла б выклікаць падазрэнні, калі б не дакладнае падабенства (у драбніцах) да іншых манетаў.

З іншых рэдкіх паўгрошаў са збору MNK варта адзначыць паўгрошы 1509 года з колцам над Пагоняй *(малюнак 6)*, 1511 года з колцам перад Арлом *(малюнак 7)*, 1512 года з поўнай датай *(малюнак 8)*, 1513 года з памылкай DVCSI *(малюнак 9)*, 1514 года з памылкай LITVNIE *(малюнак 10)*, 1522 года з памылкай LITVANIDI *(малюнак 11)*, 1527 года з памылкай SIGISMAVNDI *(малюнак 12)*, 1527 года з памылкамі ў даце 151ZΛ і ў легендзе SIGISMVNOI *(малюнак 13)*. Са збору MNW — паўгрошы 1518 года з колцам пасля крыжа і люстэркавай літарай D у імені князя *(малюнак 14)*, 1519 года з памылкамі ў даце 5191 і ў легендзе LITANIE *(малюнак 15)*, 1521 года з памылкай у даце 151Z *(малюнак 16)*, 1522 года з памылкай MAGI *(малюнак 17)*, а таксама



**A) Са збору MNW — Нацыянальнага музея ў Варшаве (Польшча).**



**B) Са збору MNK — Нацыянальнага музея ў Кракаве (Польшча).**

***Малюнак 5.*** *Два экзэмпляры рэдкага паўгроша 1508 года.*



***Малюнак 6.*** *Паўгрош 1509 года з колцам над Пагоняй (збор MNK).*



***Малюнак 7.*** *Паўгрош 1511 года з колцам перад Арлом (збор MNK, экс-калекцыя Э. Гутэн-Чапскага).*



***Малюнак 8.*** *Паўгрош 1512 года з поўнай датай (збор MNK, экс-калекцыя Э. Гутэн-Чапскага).*



***Малюнак 9.*** *Паўгрош 1513 года з памылкай DVCSI (збор MNK).*



***Малюнак 10.*** *Паўгрош 1514 года з памылкай LITVNIE (збор MNK, экс-калекцыя Э. Гутэн-Чапскага).*



***Малюнак 11.*** *Паўгрош 1522 года з памылкай LITVANIDI (збор MNK).*



***Малюнак 12.*** *Паўгрош 1527 года з памылкай SIGISMAVNDI (збор MNK).*



***Малюнак 13.*** *Паўгрош 1527 года з памылкамі ў даце 151ZΛ і ў легендзе SIGISMVNOI (збор MNK, экс-калекцыя Э. Гутэн-Чапскага).*



***Малюнак 14****. Паўгрош 1518 года з колцам пасля крыжа і люстэркавай літарай D у імені князя (збор MNW).*



***Малюнак 15****. Паўгрош 1519 года з памылкамі ў даце 5191 і ў легендзе LITANIE (збор MNW).*



***Малюнак 16****. Паўгрош 1521 года з памылкай у даце 151Z (збор MNW).*



***Малюнак 17****. Паўгрош 1522 года з памылкай MAGI (збор MNW).*



***Малюнак 18****. Тагачасная падробка паўгроша Жыгімонта Старога (збор MNW).*



***Малюнак 19****. Паўгрош 1519 года з памылкамі ў даце 5191 і ў легендзе LITANIE (збор ZKW).*

вельмі характэрную тагачасную падробку паўгроша Жыгімонта Старога *(малюнак 18)*, а са збору ZKW — паўгрош 1519 года з памылкамі ў даце 5191 і ў легендзе LITANIE *(малюнак 19)*.

Таксама ўдалося развянчаць некаторыя міфалагічныя варыяцыі паўгрошаў, перадусім з калекцыі Э. Гутэн-Чапскага, якія раней апісваліся даследнікамі як рэдкія. Напрыклад, паўгрош "з датай на рэверсе" (VII-P-13.204, нумар Гутэн-Чапскага — 7054) відавочна стаў вынікам падвойнага адбітку па перагорнутым кружку манеты.

У цэлым вопыт супрацоўніцтва з найбуйнейшымі польскімі музеямі можна назваць вельмі станоўчым і перспектыўным. Сардэчна рэкамендую іншым даследнікам.

***Источники:***

*1. Ivanauskas Eugenijus, Douchis Robert J. Coins of Lithuania 1386—1707, Vilnius, 1999.*

*2. Гулецкі Дзмітры. Паўгрошы літоўскія Жыгімонта Старога: новае ў пытаннях вывучэння і класіфікацыі // Банкаўскі веснік. 2006. № 28.*

*3. Какареко Виктор. Монеты литовские Александра (1492—1506). Папярэдняя публікацыя аўтара, змешчаная ў Сеціве па адрасе: http://skarb.khoz.ru/numizmatika/katalogi/index.php (версія 27.09.2007, доступ толькі для зарэгістраваных карыстальнікаў).*